УДК 902.3(476.4) «04/14»

# ВЫРАБЫ З КАЛЯРОВЫХ МЕТАЛАЎ З РАСКОПАК БЫХАВА Ў 2016 г.

**Галынскі Раман Дзмітрыевіч**
магістр гістарычных навук,
галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры
і па справах моладзі Быхаўскага райвыканкама; аспірант
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова
(г. Быхаў, г. Магілёў, Беларусь)

У ліпені 2016 г. прайшла першая навуковая археалагічная экспедыцыя ў г. Быхаве. Пад час раскопак быў ускрыты шурф агульнай плошчай 8 квадратных метраў. Даследаванні ажыццяўляліся на тэрыторыі “старога” горада ў межах абарончых умацаванняў, на паўночным ускрайку паселішча.

Сярод разнастайнага і шматлікага археалагічнага матэрыяла, які складаўся з керамічных вырабаў (побытавы і сталовы посуд, будаўнічыя кераміка), шкляных вырабаў (посуд, упрыгожванні і будаўнічыя матэрыялы), прысутнічалі вырабы з металаў (чорнага і каляровых). Менавіта пра рэчы з каляровых металаў і пойдзе размова ў прапанаваным артыкуле.

Металічныя вырабы з каляровых металаў можна падзяліць адразу на некалькі катэгорый: нумізматычны матэрыял, металапластыка і ювелірныя вырабы, мілітарыі, вырабы невядомага прызначэння і прадукты металаапрацоўкі.

Папярэдне неабходна адзначыць, што захаванасць металічных вырабаў і асабліва артэфактаў з каляровых металаў, якія датуюцца раней сярэдзіны XIX ст. вельмі кепская, што адлюстравана моцнай каразіраванасцю рэчаў. Таксама частка з іх пацярпела ў агні.

Так, у складзе нумізматычнай калекцыі апынуліся наступныя манеты:полкапейкі (Мікалай II), полкапейкі 1840 г. (2 экз.), 2 капейкі 18... г., палушка 1735 г., лускавінка-фальшак (?) XVII ст., шэлягі літоўскія і польскія (4 экз.).

Да металапластыкі выпадае аднесці дрэйдл. Гэта спецыфічны габрэйскі рэлігійны атрыбут – гадальны ваўчок (кубік на спіцы). З чатырох бакоў артэфакта прасочваюцца літары-словы, па якіх гадалі на Ханукy, таксама ён з’яўляецца і дзіцячай цацкай. Рэч выраблены са свінцу і паходзіць са слоя канца XVIII–XIX стст.

Першы артэфакт са складу ювелірных вырабаў прадэманстраваны створкай крыжа-энкалпіёна (фота 1). Крыж выпадае датаваць XVI ст. Гэта медная копія-пераліўка з крыжа больш ранняга вырабу, прыкладна XIII–XIV стст. [1]. Першапачаткова меркавалася, што рэч выканана з бронзы, але падчас апрацоўкі праступіў чырвона-карычневы остаў пад пацінай зялёнага колеру. Створка дрэнна захавалася, моцна каразіравана, пацярпела ад агню, дэфармавана. Пасля пэўнай хімчнай і фізічнай ачысткі, з пад слою паціны праступілі раставая выява святара (Маці Божая альбо Архангел Сіхаіл) і выявы чатырох святых. Неабходна звярнуць увагу на захаванасць мацавальных пяцель на абодвух канцах крыжа – яны адзінарныя. Створка паходзіць са слою пажара. Усяго вызначаны сляды дзвух моцных пажараў, па керамічным матэрыяле выпадае датаваць абодва пажары другой паловай XVI – пачаткам XVII ст.

Другі – ніжняя частка меднага нацельнага крыжыка канца XVIII–XIX стст.

Гузікі ж прадэманстраваны дзьвума экзэмплярамі: гузік з выявай пяціпрамянёвай зоркі з сярпом і молатам і гузіка з абламанай часткай з каляровага метала (засталася толькі пятля з дзяржаннем з чорнага метала). Абодва вырабы паходзяць з першага слою.

Да вырабаў невядомага прызачэння адносяцца: сагнутая медная пласцінка з трыма адтулінамі і штампаваным арнаментам, пласцінка-накладка на пас (?) і, магчыма, фрагмент вертка ад самавара ці ручкі ад мэблевай дзвёркі.

Да рэчаў, звязаных з вайсковай справай адносяцца кулі – цэлыя (2 экз.) і расплюшчаныя (1 экз.). З цэлых мілітырый падаецца вызначыць мушкетную кулю – 12 мм у дыяметры і кулюдрабіну дыяметрам 3 мм. Прысутнічае свінцовы выраб, які нагадвае фіксатар да мушкетнага крэменю.

Прадукты металаапрацоўкі – кроплі і аплаўкі свінца і медзьутрымліваючага (на гэта ўказвае паціна зялёнага колеру) сплава і, гэтак званая “цындра”. Частка свінцовых кавалкаў магла з’яўляцца фіксатарам да ружэйных крамянёў, ці зажымамі ваконных шыбак. Усе кавалкі свінцу паходзяць з глыбіні не перавышаючай 35–40 см. Цындрай (выраз захаваўся на Украіне) называлі ў XVIII–XIX стст. шлак, альбо брак пры ліцці бронзы. Яго выкарыстоўвалі пры вырабе палівы зялёнага колеру для аздобы керамічнай прадукцыі (посуд, кафля, клінкер і г. д.). Рэчы, знойдзеныя ў раскопе, у напластаваннях другой паловы XVI – пачатку XVII ст. уяўляюць порыстую, лёгкую безформавую масу чырвона-карычневага колеру на зломе, пакрытую пацінай зялёнага колеру. Яшчэ адной асаблівасцю гэтых “цікавостак” з’яўляецца адсутнасць хоць якога сігнала пры навядзенні на іх металашукальніка. Ёсць, аднак, меркаванне, што гэта не цындра ўвогуле, а проста моцна перапалены, пацярпеўшы ў агні, нейкі медны, ці бронзавы артэфакт. Што тычыцца свінцовых аплаўкаў, то яны могуць быць і звычайнымі свінцовымі кулямі, патрапіўшымі ў агонь пажарышча.

Падсумоўваючы мы бачым, што артэфакты з каляровых металаў, як мілітарныя вырабы, так і нумізматычны матэрыял з побытавымі рэчамі адлюстроўвае разнастайныя бакі паўсядзённага жыцця быхаўчан на працягу XVI–XIX стст. Усяго выяўлена 32 артэфакта. Пэўныя хімічныя характарыстыкі культурнага слоя (патрабуюць дадатковых даследаванняў) не далі магчымасці не толькі ўдасканаліць марфалагічную прыналежнасць амаль паловы рэчаў, а нават не дазволілі і проста класіфікаваць артэфакты. З гэтай прычыны, яны аднесены да вырабаў невядомага прызначэння. Не трэба пакідаць па-за ўвагай і факт “прыкіпання” да некаторых вырабаў (энкалпіён, накладка, манеты) арганічных парэштак аў – трэскі, салома, апілкі і, нават, малінавае (?) зярнятка. Гэтая акалічнасць ускосна пацвярджае думку даследчыка аб тым, што раскоп “патрапіў” не на маставую, як планавалася, а на двор, ці гаспадарчы аб’ект. Усе артэфакты выраблены са свінца і медзьутрымліваючых сплаваў (бронза, латунь) і, хутчэй за ўсё, маглі выкарыстоўвацца ў паўсядзённым жыцці познесярэднявечнага Быхава і не выпадаюць за межы стандартнага комплексу ўрбаністычных рэчаў.

ЛІТАРАТУРА
1. *Корзухина, Г. Ф.* Древнерусские энколпионы. Кресты-реликвии XI–XIII вв. / Г. Ф. Корзухина, А. А. Пескова. – СПб. : Петербургское Востоковедение, 2003. – 432 с.





Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова